✻**17 снежня** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылі выстаўку **«Энцыклапедыя. Нацыянальны праект»**, прысвечаную 50-годдзю стварэння першай беларускай універсальнай энцыклапеды.

«Дзяржаўным народам прызнаецца народ, які мае свае герб, гімн, сцяг, буквар і энцыклапедыю», – сцвярджаем мы разам з Максімам Танкам. Шматтомныя выданні, над якімі працавалі найлепшыя навукоўцы свайго часу, станавіліся адметнай з'явай у культурным жыцці кожнай нацыі.

Эспазіцыя адлюстроўвае гісторыю еўрапейскіх энцыклапедычных выданняў ад антычных часоў да сучаснасці. Сярод іх: праобраз еўрапейскіх універсальных энцыклапедыяў – «Натуральная гісторыя» Плінія (у ліёнскім выданні XVI ст.), першая энцыклапедыя сучаснага тыпу, кніжны шэдэўр эпохі Асветніцтва – французская «Энцыклапедыя, ці Тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамёстваў» Д. Дзідро (1751 – 1780), самая аўтарытэтная ўніверсальная энцыклапедыя на англійскай мове – «Брытаніка» (1875 – 1888), самая паспяховая нямецкая энцыклапедыя – «Энцыклапедыя Бракгаўза» (Германія, 1882 – 1887), універсальныя энцыклапеды на нацыянальных мовах Польшчы, Чэхіі, Расіі, Украіны (XIX – XX стст.).

Таксама на выставачнай пляцоўцы размешчаны найлепшыя кнігі выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», адзначаныя ўзнагародамі нацыянальных і міжнародных конкурсаў.

Наведнікі могуць азнаёміцца з гісторыяй узнікнення айчыннага энцыклапедычнага праекта, які ўключае кірылічныя лексіконы XVII ст., архіўныя матэрыялы і выданні, што адлюстроўваюць першыя спробы стварэння беларускай энцыклапеды ў 1920 – 1930-я і 1950-я гг., а таксама ўнікальныя дакументы, фотаздымкі, працоўныя і творчыя матэрыялы калектыву беларускіх энцыклапедыстаў пад кіраўніцтвам галоўнага рэдактара Петруся Броўкі.

Азнаёміцца з экспазіцыяй можна да 17 лютага наступнага года.

✻**18 снежня** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў прадставілі **экспазіцыю праекта беларускага павільёна**, які прайшоў адбор і ўдзельнічаў у 58-м Венецыянскім біенале.

Венецыянскі біенале – гэта прэстыжны сусветны форум мастацтва, што праводзіцца раз у два гады ўжо больш за 100 гадоў (з 1895 г.). 58-ы Міжнародны біенале сучаснага мастацтва прайшоў з 11 мая па 24 лістапада, тэма выстаўкі «Каб вам жыць у цікавыя часы» (May you live in interesting times) – цытата нібыта старажытнага ўсходняга праклёну, кажа пра складанасць цяперашняга моманту, з'яўляецца ініцыятарам даследавання жыцця ў эпоху пераменаў, месца ў ёй чалавека і мастацтва.



*Алена Ляшкевіч у Магілёве*